*Український історичний збірник, Вип. 11, 2008*

*Вялікі Анатоль*
*(Мінск)*

# ПЕРАСЯЛЕННЕ ЎКРАІНСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА З БЯЛА-ПАДЛЯСКАГА РАЙПРАДСТАЎНІЦТВА СНК БССР ВА УКРАІНУ ў 1944–1946 гг.

Другая сусветная вайна прывяла да істотных тэрытарыяльных змен, усталявання новых межаў у Цэнтральна-Усходняй Еўропе. Змены межаў непазбежна выклікалі, і гэта таксама было адным з істотных вынікаў вайны - перасяленні насельніцтва ў пасляваеннай Еўропе. У еўрапейскія перасяленчыя працэсы была ўцягнуты і тры колішнія савецкія рэспублікі – Беларусь, Украіна і Літва, якія ў верасні 1944 г. заключылі з Польскім Камітэтам Нацыянальнага Вызвалення (ПКНВ) двухбаковыя пагадненні аб "эвакуацыі" беларускага, ўкраінскага, рускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы на іх тэрыторыі, а польскага – з тэрыторыі заходніх абласцей БССР, УССР і ЛітССР у Польшчу.

Адзначу, што па праблеме перасялення ўкраінцаў з Польшчы ва Украіну ў 1944-1946 гг. шмат напісана ўкраінскімі гісторыкамі[1]. Аднак у іх працах увага надавалася аналізу выканання ўмоў украінска-польскага пагаднення ад 9 верасня 1944 г. аб "эвакуацыі" ўкраінскага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы ва Украіну, а польскага – з УССР у Польшчу, ўзаемаадносінам украінцаў і палякаў у час гэтай акцыі і г.д. Аднак ні ў польскай, ні ў беларускай, ні ва ўкраінскай гістарыяграфіі не разглядаўся такі аспект гэтай праблемы, як перасяленне ўкраінскага насельніцтва з Бяла-Падляскага ўезда Люблінскага ваяводства, якое ажыццяўлялі ўпаўнаважаныя СНК БССР па перасяленню. Паўстае пытанне, чаму беларускія ўпаўнаважаныя займаліся перасяленнем украінцаў ? Справа ў тым, што Бяла-Падляскі ўезд у адпаведнасці з беларуска-польскім пагадненнем аб "эвакуацыі" беларускага, рускага, ўкраінскага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы ў СССР, уваходзіў у склад Бяла-Падляскага райпрадстаўніцтва і беларускія ўпаўнаважаныя, перасяляючы з яго беларусаў, вымушаны былі перасяляць і ўкраінцаў.

Праца па ўліку, рэгістрацыі і адпраўцы ўкраінскага насельніцтва з Бяла-Падляскага райпрадстаўніцтва ва Украіну распачалася з сярэдзіны кастрычніка 1944 г., пасля ўзгаднення тэкста аб'явы аб умовах перасялення з Галоўным упаўнаважаным ПКНВ. Улік насельніцтва паказаў, што з усіх 12 райпрадстаўніцтваў (Аўгустоўскага, Бельскага, Бяла-Падляскага, Валілаўскага, Замбраўскага, Бельскага, Кнышынскага, Лапскага, Ломжынскага, Сямяціцкага, Саколкаўскага і Цэханавецкага), найбольшая колькасць украінцаў была ўлічана ў Бяла-Падляскім райпрадстаўніцтве, у той час як у астатніх іх мелася нязначная колькасць. Ва ўсіх райпрадстаўніцтвах было зарэгістравана 4043 украінскія гаспадаркі, агульнай колькасцю 13 925 чалавек, якія належылі перасяленню ў СССР[2]. Што ж датычыць Бяла-Падляскага райпрадстаўніцтва, то ў ім за весь час было ўлічана 3978 гаспадарак, якія налічвалі 15 474 чалавекі, што складала 12, 1 % ад усёй колькасці насельніцтва райпрадстаўніцтва[3].

Разам з тым, да гэтых дадзеных неабходна ставіцца дастаткова крытычна, бо ўлік праводзіўся ў надта складаных умовах: дзейнасці польскага падполля, няўстойлівасці польскай мясцовай улады, нежадання насельніцтва рэгістравацца і г.д. Так, намеснік Галоўнага ўпаўнаважанага СНК БССР М.Джагараў адзначаў,

што "з чэрвеня 1945 г. з-за ўзмоцненай дзейнасці банд (М. Джагараў меў на ўвазе дзейнасць польскага падполля – Арміі Краёвай. – А.В.) выезд у вёскі і асабліва правядзенне там сходаў, гутарак з сялянамі сталі немагчымымі"[4]. На самай справе, ўпаўнаважаныя СНК БССР у Польшчы амаль штодня рызыкавалі жыццём, праводзячы ўлік, рэгістрацыю і адпраўку насельніцтва ў БССР. Вось толькі фрагмент аднаго з данясенняў, якія накіроўвалі першаму сакратару ЦК КП(б)Б П.Панамарэнку, міністру замежных спраў БССР К.Кісялёву ды іншым службовым асобам упаўнаважаныя СНК БССР з Польшчы: «У апошні час назіраецца шэраг нападаў банд так званай АК на работнікаў раённых упаўнаважаных. 25 лютага 1945 г. у вёсцы Ракітна Бяла-Падляскага раёна банда ў колькасці 10 чалавек здзейсніла напад на дом, дзе начаваў намеснік раённага ўпаўнаважанага т. Паплаўскі і сакратар т. Алейнікаў. У выніку перастрэлкі т. Паплаўскі атрымаў кулявое раненне правага бядра з пераломам косці і другой куляй ранены ў другую нагу. У час перастрэлкі т. Алейнікаў забіў аднаго бандыта […]»[5]. Наколькі моцнай з'яўлялася дзейнасць падполля, сведчыць таксама запіска П.Панамарэнкі «Аб ходзе працы па эвакуацыі беларускага, рускага і ўкраінскага насельніцтва з Польшчы на тэрыторыю СССР», якую ён у снежні 1945 г. накіраваў І.Сталіну. Першы сакратар ЦК КП(б)Б падкрэсліваў, што «масава-прапагандысцкая праца, якая праводзіцца нашым перасяленчым апаратам, з'яўляецца недастатковай і праводзіцца толькі ў асобных вёсках, бо ў месцы дзейнасці банд выезд немагчымы»[6]. Улічваючы гэтыя фактары магчыма лічыць, што ўкраінскага насельніцтва ва ўсіх вышэйадзначаных райпрадстаўніцтвах было больш, чым зарэгістравалі ўпаўнаважаныя СНК БССР па перасяленню.

Разам з улікам, сярод насельніцтва праводзіліся гутаркі, у час якіх растлумачваліся парадак, умовы перасялення, распавядалася аб "шчаслівым жыцці" ў Савецкім Саюзе" і г.д. Акрамя гэтага ва ўсіх вёсках, дзе пражывалі ўкраінцы, праводзіліся сходы, чыталіся лекцыі пераважна палітычнага, сацыяльна-эканамічнага характару. Галоўная мэта агітацыйна-прапагандысцкай працы заключалася ў тым, каб пераканаць украінцаў у неабходнасці перасялення ў Савецкі Саюз. Так, у Бяла–Падляскім райпрадстаўніцтве на працягу перасялення было прачытана 215 лекцыі і дакладаў[7]. Аднак, нягледзячы на разнастайнасць форм і метадаў агітацыі, якія выкарыстоўвалі ў сваёй працы ўпаўнаважаныя СНК БССР ды шматлікія прапагандысты і агітатары, каб схіліць украінцаў да перасялення ў СССР, вынік іх працы і намаганняў быў мінімальны. Большасць украінцаў Бяла–Падляскага ўезда праігнаравала перасяленчую акцыю і не пажадала выехаць ва Украіну. Агульным, што ўтрымлівала іх ад пераезду ва УССР, з'яўлялася наступнае: неўспрыняцце савецкай улады, «прывязанасць» да сваёй уласнасці і маёмасці, роднасныя, сяброўскія сувязі ды іншае. Сітуацыя, якая мела месца ў Бяла-Падляскім ваяводстве адлюстроўвала агульную сітуацыю з перасяленнем украінцаў. Большасць украінскага насельніцтва, якое пражывала ў Польшчы адмовіліся пераязджаць у савецкую Украіну. Так, па падліках украінскага гісторыка І.Вінніччэнкі толькі 7,8% украінцаў дабраахвотна пагадзіліся перасяліцца ва Украіну[8].

Першыя цягнікі з украінскімі перасяленцамі з Бяла-Падляскага райпрадстаўніцтва накіраваліся ва Украіну праз Беларусь напачатку кастрычніка 1944 г. Перавозка перасяленцаў ажыццяўлялася выключна чыгуначным транспартам. Спачатку перавозку перасяленцаў і іх маёмасці да чыгуначных станцый ажыццяўлялі 428 аўтамашын, якія прадставіла ў распараджэнне ўпаўнаважаных СНК БССР па перасяленню камандаванне воінскіх частак Чырвонай Арміі. Аднак з наступленнем войскаў Чырвонай Арміі на захад падвоз

перасяленцаў ды іх маёмасці ўскладніўся, бо для гэтага пачалі выкарыстоўваць падводы. Усяго за 1944-1946 гг. для гэтых мэт было выкарыстана 7130 падвод[9].

Уяўленне аб сацыяльным, эканамічным, маёмасным становішчы, складзе сям'і украінскіх перасяленцаў, а таксама дзе ва Украіне яны б жадалі б жыць магчыма праілюстраваць на прыкладзе насельніцтва вёскі Паўлаў-Новы Янаў-Падлескай воласці Люблінскага ваяводства, з якой пажадала выехаць у Мікалаеўскую вобласць Украіны 25 гаспадарак[10].

Эканамічнае становішча гэтых гаспадарак было надта стракатым. Колькасць зямлі, якой валодалі сялянне, вагалася ад 1 да 15,7 га. Так, ад 1 ад 3 га зямлі мелі 5 гаспадароў, ад 3 га да 5 га адпаведна – 4, ад 5 га да 10 га – 7, ад 10 га да 15 га – 7. Дзве гаспадаркі ўвогуле не мелі зямлі[11]. Аналіз эканамічнага становішча выявіў надта цікавую акалічнасць. Так, заможныя сем'і, якія мелі ад 7 і болей гектар зямлі ў заявах пісалі, што яны і ва Украіне жадалі б атрымаць не меншыя надзелы зямлі і займацца аднаасобнай гаспадаркай. Так, напрыклад, А. Казубей, які меў 15, 7 га зямлі, напісаў у заяве, што ён жадае атрымаць у Мікалаеўскай вобласці 15 га зямлі і займацца аднаасобнай гаспадаркай. Аб заможнасці і гатоўнасці гэтага гаспадара працаваць аднаасобна сведчыць рухомая і нерухомая маёмасць, якую ён перавозіў з сабой з Польшчы ва Украіну: два кані, тры каровы, шэсць свіней, шэсць авечак, дзве бараны, плуг, саламарэзку ды іншы дробны сельскагаспадарчы інвентар[12]*. Не менш заможнай была гаспадарка І. Ляшука, які ў Польшчы меў 11,1 га зямлі, а ва Украіне жадаў атрымаць 15 га. З сабой ён перавозіў 2 кані, 2 каровы, 10 свіней, 4 авечкі, 2 плугі, 2 бараны, адну саламарэзку, малацілку і веялку[13]. Крыху меней зямлі меў М.Зарэмба. У Польшчы ён меў 6,8 га, аднак у Мікалаеўскай вобласці жадаў атрымаць 10 га зямлі і таксама займацца аднаасобнай працай. Ён перавозіў з сабой 1 каня, 2 каровы, 2 свінні, 1 плуг, 2 бараны, 1 саламарэзку[14]. З гэтай вёскі гаспадары перавезлі з сабой ва Украіну 21 каня, 37 кароў, 70 свіней, 54 авечкі[15]. Калі ж узяць ўсё Бяла-Падляскае райпрадстаўніцтва, то ўкраінскімі перасяленцамі было вывезена ва Украіну: 906 коней, 1813 кароў, 2397 свіней, 2290 авечак. Па вопісам было перададзена польскім уладам: 7662 га зямлі, 2204 га азімых пасеваў, 6052 жылых пабудоў, 1821 надворная пабудова, 31 калодзеж, 2 царквы. Агульны кошт пераданай маёмасці склаў 3 093 033 р. Акрамя гэтага было здадзена Чырвонай Арміі збожжа – 50 т., бульбы – 2452 т., сена і саломы – 1141 т.[16]

Увогуле ж, з 25 гаспадарак, якія перасяляліся ва Украіну, толькі 8 пажадалі атрымаць зямлю і займацца аднаасобнай працай. Астатнія 17 гаспадарак пісалі ў сваіх заявах, што яны жадаюць працаваць у калгасах ды саўгасах. У сувязі з вышэйадзначаным неабходна падкрэсліць наступнае. І ў беларуска-польскім, і ва ўкраінска-польскім пагадненнях пазначалася. што перасяленцы з Польшчы маюць права атрымаць на новых месцах жыхарства не болей за 15 га зямлі і займацца аднаасобнай гаспадаркай. Аднак гэты пункт пагаднення меў абсалютна прапагандысці характар. Ці мог селянін-аднаасобнік атрымаць 10 ці 15 га зямлі ва ўсходніх абласцях савецкай Украіны, куды галоўным чынам накіроўвалі перасяленцаў*, дзе ўжо даўно панавала калгасна-саўгасная сістэма з яе прымусовай працай, галечай, бясконцымі і непамернымі дзяржаўнымі пазыкамі, вялізнымі падаткамі, штогадовымі здачамі дзяржаве сельскагаспадарчай прадукцыі і г.д. Безумоўна, не. Магчыма толькі выказаць меркаванне, што ніводны з перасяленцаў не атрымаў жаданай зямлі, а замест аднаасобнай гаспадаркі трапіў разам з прывезенай жывёлай у калгасы ды саўгасы Мікалаеўскай вобласці.

Разам з сялянствам ва Украіну выязджала і праваслаўнае святарства, якое не бачыла для сябе сэнсу заставацца ў каталіцкім асяроддзі. Вось, напрыклад, якую

заяву падаў 3 снежня 1944 г. Упаўнаважанаму СНК БССР па Бяла-Падляскаму райпрадстаўніцтву святар праваслаўнай царквы ў в. Гнойна Заканальскай воласці Антоній Кансоўскі: «Выказваю жаданне перасяліцца і забраць царкоўную маёмасць і царкоўныя прылады ў сувязі з эвакуацыяй прыхода з тэрыторыі Польшчы на тэрыторыю Украінскай ССР. Пры гэтым заяўляю, што ў сувязі з хуткасцю перасялення я не змог здаць ключы ад царквы ў Холмскую духоўную кансісторыю. Таму здаю ключы раённаму ўпаўнаважанаму Урада Беларускай ССР па эвакуацыі з тэрыторыі Польшчы ў БССР. […] Акрамя гэтага ў в. Гнойна застаецца цагляны храм, драўляная малітоўня на могілках, жылы дом, хлеў, пуня»[17].

Айцец А.Кансоўскі разам з прыхажанамі свайго прыходу перасяляўся ў Адэскую вобласць УССР. З царкоўнай маёмасці ён змог забраць з сабой наступнае: прастол з ахвярнікам, іканастас, два панікадзілы, труну Хрыста Збавіцеля, чатыры аналоі, тры шкафы, 10-ць вялікіх і 20-ць малых ікон, восем харугваў, тры крыжы, 5-ць камплектаў адзення святара, 20-ць скацёрак, 8 рушнікоў і 100 кг. дробных царкоўных рэчаў. Нерухомай царкоўнай маёмасці ў Польшчы засталося на 91 092 рублі[18].

20 снежня 1944 г. у Херсонскую вобласць УССР разам са сваімі прыхажанамі выехаў і святар праваслаўнай царквы з в. Дрэлева Загойскай воласці Радзынскага ўезда Зміцер Хамяк. Дрэлеўская праваслаўная царква была крыху меншая за Гнойненскую. Айцец З. Хамяк змог узяць з сабой адзін іканастас, 7 вялікіх ікон, 6-ць створаў, 4 харугвы, два крыжы ды іншую дробную царкоўную маёмасць[19]. Праваслаўная царква, якая была пабудавана ў 1863 г., іншыя царкоўныя пабудовы і зямельны надзел памерам 22 га, часова перадаваліся пад ахову Упаўнаважанага СНК БССР па Бяла-Падляскаму райпрадстаўніцтву. Зараз пакуль немагчыма адказаць, што сталася з гэтымі праваслаўнымі храмамі, пасля перадачы іх польскім уладам.

Адзначу, што частка праваслаўнага духавенства выступала супраць перасялення. Так, у справаздачы Упаўнаважанага па Бяла-Падляскаму райпрадстаўніцтвк адзначалася, што «праваслаўнае духавенства шырока разгарнула агітацыйную працу сярод беларускага, ўкраінскага, рускага насельніцтва супраць эвакуацыі ў СССР. У жніўні і верасні 1945 г. ва Украінскай праваслаўнай царкве ў г. Лодзі святар Лукаянцаў, былы настаўнік, прачытаў дзе лекцыі на тэму «Сацыяльныя праблемы ў асвятленні хрысціянскай царквы». Лекцыі суправаджаліся царкоўнымі спевамі. Лукаянцаў у рознай форме крытыкаваў і скажонна падаваў сацыялістычнае будаўніцтва ў СССР, асабліва жыццё калгаснікаў»[20].

Агітацыйна-прапагандысцкая праца, праводзімая супрацоўнікамі апарата Упаўнаважанага СНК БССР па Бяла-Падляскаму райпрадстаўніцтву была неэфектыўная, бо большасць украінскага насельніцтва адмовілася выязджаць у СССР. Асноўнай прычынай, якая вымушала ўкраінцаў усё ж заставацца ў Польшчы, адпаведна заключэнню Упаўнаважанага СНК БССР, з'яўлялася тое, што «прыбыўшыя рэпатрыянты з СССР праводзяць сярод беларускага, ўкраінскага, рускага насельніцтва варожжую агітацыю супраць Савецкага Саюза і калгаснага будаўніцтва, скажона тлумачаць сапраўднае жыццё селянства, палохаюць голадам у калгасах, палохаюць тым, што ў БССР і УССР усе вёскі спаленыя і няма дзе жыць. У выніку гэтага многія палохаюцца і адмаўляюцца эвакуіравацца»[21]. Аб тым, што гэта быў вельмі істотны фактар, сведчыць радыёграма Галоўнага Упаўнаважанага СНК БССР І.Кругліка, накіраваная намесніку Старшыні СНК БССР К.Кісялёву ў красавіку 1946 г., у якой паведамлялася: «з эвакуіраваных з Польшчы ў СССР у 1944-1945 гг. беларусаў, рускіх, украінцаў за апошні час вярнулася ў Польшчу

значная колькасць гаспадарак. Толькі ў Бяла-Падляскі павет з СССР вярнулася на свае старыя месцы 73 гаспадаркі колькасцю 226 чалавек, ёсць некалькі выпадкаў вяртання ў Бельскі павет, Сямяціцкую, Валілаўскую гміны"[22]. Аднак найбольшую трывогу і заклапочанасць І.Круглiка вызываў не сам факт вяртання, а тое, што, "вяртаючыся з БССР, беларусы сваімі расказамі аднавяскоўцам аб прычынах свайго вяртання вядуць унушальную прапаганду супраць перасялення ў БССР. Па Бельскаму, Бяла-Падляскаму паветах, куды вярнуліся раней эвакуіраваныя з БССР, нават падаўшыя заявы на эвакуацыю селянне-беларусы зараз адмаўляюцца эвакуіравацца"[23]. У поўнай меры гэта датычць і да ўкраінцаў. На самай справе, пераехаўшы з Польшчы ва Украіну перасяленцы апынуліся ў надта цяжкім сацыяльна-эканамічным становішчы і выказвалі жаданне вярнуцца назад у Польшчу, а таксама паведамлялі ў лістах родным, каб тыя не перасяляліся ў Савецкі Саюз. Так, перасяленец Суханькок С., які трапіў у Дняпропятроўскую вобласць напісаў родным у Польшчу наступнае: "Жыццё нашае вельмі дрэннае. Дарагія тата і мама, калі вы думаеце адтуль выязджаць (г.зн. з Польшчы – А.В.), то не рухайцеся з месца, а жывіце там дзе вы жывеце"[24]. Жаданне многіх перасяленцаў вярнуцца на сваё старое месца жыхарства адзначалі і афіцыйныя ўлады. Так, В. Абакумаў 6 жніўня 1946 г. паведамляў Л.Берыі, што "на тэрыторыю Украінскай ССР прыбыло 112 865 сямей украінца-перасяленцаў, агульнай колькасцю 442 420 чалавек, значная частка якіх знаходзіцца ў цяжкіх матэрыяльных і жыллёва-побытавых умовах [...]. На глебе цяжкіх матэрыяльных умоваў многія перасяленцы пакідаюць раёны ўсходніх абласцей Украіны і пераязджаюць у заходнія вобласці з мэтай перабрацца ў Польшчу"[25].

Перасяленне ўкраінскага (як і беларускага) насельніцтва з Польшчы ва Украіну мела адзін надта балючы аспект, які тычыцца ўзаемадносін польскага падполля – Арміі Краёвай (АК) і перасяленцаў. З пункту гледжання АК украінцы (і беларусы) з'яўляліся ў Польшчы непажаданным «элементам», які за ўсялякі кошт неабходна было прымусіць выехаць з польскай тэрыторыі. З гэтай мэтай польскае падполле прымяняла пагрозы, а ў шматлікіх выпадках гвалты, рабункі, «пацыфікацыі» ўкраінскага насельніцтва. Вышэй ужо ўзгадвалася пра напады на райўпаўнаважаных СНК БССР, якія ажыццяўлялі перасяленне. Аднак ад нападаў і тэрору польскага падполля яшчэ ў большай ступені цярпела мясцовае насельніцтва. Так, 28 сакавіка 1945 г. нявызначаны постакаўскі атрад колькасцю да 100 чалавек зрабіў напад на Славатычы, дзе былі забіты дзве ўкраінкі – Аляксандра Сцяпанчук і Людміла Дзямінская[26]. Тэрор польскага падполля супраць украінцаў не перапыняўся на ўсём працягу перасялення. Так, першы сакратар ЦК КП(б)Б П.Панамарэнка ў снежні 1945 г. у запісцы «Аб ходзе эвакуацыі рускага, беларускага і ўкраінскага насельніцтва з Польшчы ў СССР» адзначаў, што «[…] забойствы і рабункі беларускага, рускага і ўкраінскага насельніцтва не перапыняюцца, а становяцца паўсядзённай з'явай»[27]. Аб тэрору польскага падполля супраць украінскага насельніцтва паведамляла і польская ўлада. Так, у справаздачы Міністэрства бяспекі Польшчы ад 17 мая 1946 г. падкрэслівалася, што «найбольш нябяспечнымі раёнамі на тэрыторыі Люблінскага ваяводства з'яўляюцца паветы: Бяла-Падляск, Холмск, Хрубешуў, Лукаў, Томашуў і Владава»[28].

Перасяляючаеся ўкраінскае насельніцтва ў шэрагу выпадкаў падвяргалася рабункам з боку мясцовага польскага насельніцтва, якое скарыстоўвала безуладдзе для паляпшэння свайго матэрыяльнага дабрабыту. Напрыклад, у маі 1946 г. райупаўнаважаны СНК БССР па Бяла-Падляскаму райпрадстаўніцтву адзначаў, што, "са слоў эвакуіраваных устанаўліваецца, што, у асноўным, у рабаўніцтвах удзельнічаюць мясцовыя жыхары-палякі з суседніх вёсак і палякі, эвакуіраваныя з

БССР і УССР. Так, грамадзянін П.Сацюк заявіў, што да яго ўначы 1 красавіка 1946 г. прыйшоў жыхар вёскі Янаў-Падляска Анжыевіч і патрабаваў кантрыбуцыю. Акрамя гэтага, у яго забралі на працягу красавіка 20 тыс. злотых”[29].

Выніковыя дадзеныя аб перасяленні ўкраінцаў з Польшчы ва Украіну (па стану на 15 чэрвеня 1946 г. – дата сканчэння перасялення. – А.В.) паказалі, што пераехаць у савецкую Украіну пажадала 1587 гаспадарак, якія налічвалі 5894 чалавекі. (Гл. табл. № 2). У той жа час за ўвесь перыяд перасялення (верасень 1944 - чэрвень 1946 гг.) з Польшчы ва Украіну на аснове ўкраінска-польскага пагаднення аб “эвакуацыі” ўкраінскага насельніцтва з Польшчы перасялілася 118 724 гаспадаркі, якія налічвалі 472 655 чалавек[30]. Тады да гэтай лічбы неабходна дадаць яшчэ 1587 гаспадарак, якія налічвалі 5894 чалавекі, якіх перасялілі на Украіну Упаўнаважаныя СНК (СМ) БССР па перасяленню за аналагічны перыяд.

Разам з тым, ва ўсіх райпрадстаўніцтвах, якія ўваходзілі ў сферу дзейнасці Упаўнаважаных СНК (СМ) БССР па перасяленню, засталося 2456 украінскіх гаспадарак, якія не пажадалі пераязджаць у савецкую Украіну. Гэта значыць, што большасць украінскага насельніцтва з гэтых райпрадстаўніцтваў праігнаравала перасяленчую акцыю і нягледзячы на агітацыйна-прапагандысцкую работу засталася ў Польшчы.

Адной з асаблівасцей абмена насельніцтвам, які ажыццяўляўся на аснове беларуска-польскага пагаднення ад 9 верасня 1944 г., з’яўлялася перасяленне Упаўнаважанымі СНК БССР украінскага насельніцтва з усіх райпрадстаўніцтваў, якія ўваходзілі ў сферу іх дзейнасці і, ў прыватнасці, з Бяла-Падляскага райпрадстаўніцтва, дзе кампактна пражывала найбольшая колькасць украінцаў, што належылі перасяленню. Перасяленчая акцыя паказала, што тыя рысы, якія былі характэрны для перасялення беларусаў, былі ўласцівы і для перасялення ўкраінцаў. Галоўнымі фактарамі, якія вымушалі іх перасяляцца ва Украіну з’яўляліся грамадска-палітычныя і сацыяльна-эканамічныя. Пераважную большасць перасяленцаў-украінцаў склала аднаасобнае селянства, якое не бачыла для сябе эканамічных перспектыў заставацца ў Польшчы. Не менш важным фактарам, які вымушаў іх перасяляцца ў савецкую Украіну, з’яўляўся фактар польскага падполля, якое пагрозамі, рабункамі, «пацыфікацыямі» «выштурхівала» іх з Польшчы. Гэтыя ды і іншыя фактары дзейнічалі як сукупна так і паасобку. Разам з тым, больш за палову ўкраінцаў, пераважна заможныя гаспадаркі, так і засталіся ў Польшчы, бо для іх непрымальнай стала савецкая ўлада і галоўнае, калгасна-саўгасная сістэма, якая панавала ва Украіне.


### *Annotation*

*Ukrainians were transferred from Poland to Ukraine throw Belarus following the Polish-Belarussian agreement of 9 September 1944 on resettling Belarussians, Russians and Ukrainians from Poland to Belarus.*

*The article discusses ethnic, religious, and political motivation for resettling to Ukraine. Author shows the influence of the underground Polish movement (Armija Krajova) on the attitude of Ukrainians resettle from Poland to Ukraine during the resettling process.*

*The author analyses in details the economic power of Ukrainians resettles (on the examples of small village Pavlov-Novy) and their willing or not willing to have a land in Ukraine and work as farmers.*

*From the beginning of resettle process till mid-1946, over half of those who were registered refused to resettle in soviet Ukraine and preferred to stay in Poland. The main*

*reasons why they preferred to stay in Poland were the next: fear of soviet authority, national, religious repression in soviet Ukraine, fears of kolkhos system and inevitability of loosing of their property.*

**Табліца 1.**

**Звесткі аб зарэгістраваўшыхся на эвакуацыю беларускіх, рускіх і украінскіх гаспадарках з тэрыторыі Польшчы ў СССР па стану на 15 мая 1945 г. НА РБ, ф.4, воп.29, спр.806, арк.103**

| Паветы | | | Па нацыянальнасці | | | | | | | | Па полу | | | Па роду заняткаў | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Усяго належ. эвакуір. | Чл. сямей | **Беларусы** | Чл. сямей | рускія | Чл. сямей | Украінцы | Чл. сямей | Іншых | Чл. сямей | мужчын | жанчын | Дзяцей да 16 год | сялян | рабочых | служач. | кустароў | настаўнікаў | урачоў | ІТР | святароў |
| Аўгустоўскі | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| Бельскі | 2509 | 8681 | 2443 | 8466 | 52 | 166 | 14 | 49 | | | 2095 | 2148 | 4438 | 7425 | 112 | 27 | 23 | 3 | 1 | | 3 |
| Б.Падляскі | 1758 | 6892 | 14 | 47 | 55 | 193 | 1689 | 6652 | | | 2173 | 2477 | 2243 | 4585 | 38 | 16 | 1 | 3 | | 2 | 5 |
| Беластоцкі | 789 | 2302 | 695 | 2115 | 64 | 187 | | | | | 608 | 806 | 888 | 415 | 557 | 60 | 48 | 5 | 3 | 7 | 1 |
| Валілаўскі | 1118 | 4038 | 1067 | 3803 | 39 | 197 | 12 | 38 | | | 1072 | 1208 | 1758 | 1985 | 232 | 37 | 14 | 11 | | | 1 |
| Замбраўскі | 403 | 1535 | 392 | 1491 | 10 | 44 | | | | | 446 | 411 | 678 | 363 | 17 | | 17 | 5 | | 1 | |
| Кнышынскі | 419 | 1524 | 417 | 1518 | 2 | 6 | | | | | 397 | 416 | 711 | 534 | 17 | 2 | | 3 | | | |
| Ломжынскі | 7 | 21 | 7 | 21 | | | | | | | 2 | 14 | 5 | | | | | | | | |
| Лапскі | 278 | 984 | 278 | 984 | | | | | | | 164 | 315 | 470 | 218 | 60 | 1 | 7 | | | 1 | 1 |
| Сямяціцкі | 1823 | 6855 | 1675 | 6322 | 121 | 441 | 27 | 92 | | | 1703 | 2053 | 3099 | 3385 | 221 | 36 | 39 | 18 | 1 | | 5 |
| Сакулкаўскі | 624 | 2491 | 586 | 2372 | 29 | 90 | 9 | 29 | | | 644 | 732 | 1115 | 2391 | 80 | 4 | 10 | 3 | | 2 | |
| Цэханавецкі | 42 | 126 | 16 | 47 | 22 | 54 | 4 | 25 | | | 29 | 50 | 47 | 3 | 24 | 13 | | | 1 | 1 | |
| Пражскі | 261 | 802 | 45 | 99 | 196 | 652 | 20 | 51 | | | 221 | 336 | 245 | 96 | 197 | 30 | 2 | 10 | 6 | 11 | 11 |
| Усяго: | 10 000 | 36251 | 7635 | 27285 | 590 | 2040 | 1775 | 6936 | | | 9554 | 10991 | 15695 | 21399 | 1555 | 226 | 161 | 61 | 12 | 25 | 27 |

## Табліца 2.
## Звесткі аб зарэгістраваўшыхся на эвакуацыю беларускіх, рускіх і украінскіх гаспадарках з тэрыторыі Польшчы ў СССР па стану на 15 чэрвеня 1946 г. НА РБ, ф.789, воп.1, спр.5, арк.76

| Паветы | | | Па нацыянальнасці | | | | | | | | Па полу | | | Па роду заняткаў | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | У с я г о эвакуір. | Чл. сямей | **Беларусы** | Чл. сямей | рускія | Чл. сямей | Украінцы | Чл. сямей | Іншых | Чл. сямей | мужчын | жанчын | дзяцей | сялян | рабочых | служач. | кустароў | настаўнікаў | урачоў | ІТР | святароў |
| Аўгустоўскі | 1360 | 3944 | 1308 | 3820 | 52 | 124 | - | - | - | - | 1017 | 1482 | 1445 | 857 | 732 | 76 | 18 | 9 | 6 | 2 | 2 |
| Беластоцкі | 2148 | 7421 | 2076 | 7253 | 48 | 105 | 21 | 58 | 3 | 5 | 2096 | 2391 | 3004 | 4090 | 230 | 45 | 19 | 6 | 3 | - | 9 |
| Бельскі | 2316 | 7763 | 132 | 307 | 638 | 1676 | 1534 | 5747 | 12 | 33 | 2364 | 2922 | 2477 | 3651 | 401 | 251 | 8 | 30 | 16 | 28 | 22 |
| Б.Падляскі | 1115 | 3871 | 1078 | 3692 | 33 | 171 | 4 | 8 | - | - | 978 | 1154 | 1739 | 1817 | 107 | 58 | 4 | 6 | - | - | - |
| Валілаўскі | 296 | 1153 | 282 | 1106 | 14 | 47 | - | - | - | - | 335 | 367 | 451 | 273 | 20 | 1 | - | 1 | - | 1 | - |
| Замбраўскі | 255 | 914 | 252 | 907 | 3 | 7 | - | - | - | - | 244 | 259 | 411 | 245 | 8 | 3 | - | - | - | - | - |
| Кнышынскі | 220 | 847 | 216 | 843 | - | - | - | - | 4 | 4 | 213 | 297 | 337 | 178 | 39 | 1 | 1 | - | - | 1 | - |
| Лапскі | 6 | 15 | 6 | 15 | - | - | - | - | - | - | 3 | 6 | 6 | 15 | - | - | - | - | - | - | - |
| Ломжынмкі | 2037 | 7125 | 1928 | 6790 | 91 | 285 | 18 | 50 | - | - | 1928 | 2294 | 2903 | 2729 | 179 | 27 | 7 | 20 | - | - | 6 |
| Сямяціцкі | 782 | 2813 | 727 | 2648 | 47 | 145 | 8 | 20 | - | - | 759 | 851 | 1203 | 664 | 80 | 12 | 18 | 2 | 1 | 3 | 2 |
| Сакулкаўскі | 33 | 95 | 10 | 28 | 19 | 43 | 2 | 11 | 2 | 13 | 24 | 41 | 30 | 3 | 17 | 12 | - | - | 1 | - | - |
| Цэханавецкі | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| Усяго: | 10568 | 35561 | 8015 | 27409 | 945 | 2603 | 1587 | 5894 | 21 | 55 | 9891 | 12064 | 14006 | 14522 | 1813 | 486 | 75 | 74 | 27 | 35 | 41 |

### Табліца 3.
### Даведка аб беларускіх, рускіх і украінскіх гаспадарках, астаўшыхся на тэрыторыі Польшчы па стану на 15 чэрвеня 1946 г. НА РБ, ф.4, воп.29, спр.258, арк.13

| Паветы Беластоцкага ваяводства | Колькасць астаўшыхся гаспадарак | Членаў сямей | Па нацыянальнасці | | | Па роду заняткаў | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Бел. | Рус. | Укр. | Селянне | Рабоч. | Служач. | Кустары | Урачы | Святары |
| Аўгустоўскі | 1 136 | 5 012 | 963 | 159 | 14 | 725 | 144 | 143 | 115 | - | 9 |
| **Беластоцкі** | 7 313 | 28 329 | 7 177 | 132 | 64 | 6 241 | 32 | 459 | 521 | - | 60 |
| **Бельскі** | 2 670 | 10 372 | 95 | 305 | 2 341 | 2 627 | 28 | 7 | - | 2 | 6 |
| **Б.Падляскі** | 4 334 | 16 290 | 4 274 | 48 | 12 | 3 966 | 246 | 43 | 57 | - | 22 |
| **Валілаўскі** | 926 | 4 022 | 913 | 8 | 5 | 796 | 36 | 45 | 47 | - | 2 |
| **Замбраўскі** | 1 353 | 6 047 | 1 350 | 1 | 2 | 1 347 | 2 | - | 4 | - | - |
| Кнышынскі | 535 | 1 947 | 521 | 8 | 6 | 502 | 8 | 15 | 10 | - | - |
| Лапскі | 1 | 6 | 1 | - | - | 1 | - | - | - | - | - |
| Ломжынскі | 5 629 | 21 239 | 5 561 | 59 | 9 | 5 476 | 102 | 20 | 9 | - | 22 |
| Сямяціцкі | 1 686 | 7 059 | 1 674 | 12 | - | 1 595 | 15 | 12 | 52 | - | 12 |
| Сакулкаўскі<br>Цэханавецкі | 84 | 338 | 60 | 21 | 3 | 42 | 10 | 15 | 16 | - | 1 |
| Усяго: | 25 667 | 100 661 | 22 459 | 752 | 2 456 | 23 318 | 623 | 759 | 831 | 2 | 134 |

[1] Польша та Украіна у тридцятих-сорокових роках ХХ століття. Неведоми документи з архівів спеціальних служб. Переселення поляків та украінців 1944-1946. Т.2. / Галовні навук. ред. Е. Тухольський. Ю. Шаповал, Варшава-Киів 2000. – 1007 с.; *Ткачов С.* Польско-украінськiй т трансфер населення. 1944–1946 рр. Виселення поляків з Тернопілля. – Тернополь, 1987; *Вінніченко I.I.* Украіна 1920–1946: депортаціі, заслания, вислания. – К, 1994; *Буцко О.В.* К истории украинско-польского переселения 1944–1946 гг. // Украіна у другій світовій війні: урокі історіі та сучасність: Мат. міжнар. наук. конф. (27-28 жовт. 1994 р.). – К., 1995. – С. 241–145; *Буцко О.В*. Украина–Польша: миграционные процессы 40-х годов / Ред. кол.: С.В. Кульчицкий (гл. ред.) и др. НАН Украины. Ин-т истории Украины. – К., 1997. – 149 с.; *Куцак В.М.* Переселення украінців Польщі до УРСР (1944–1947 рр.) // Національний пед. ун-т ім. М.П. Драгоманова. Навукові записки: Зб. наук. ст. – К., 2000. – Т. 36. – Ч. 3: (педагогічні та історичні науки). – С. 153–160; *Макарчук С.* Розміщення украінськіх переселенців з Польщі в Украіні у 1944–1947 рр. // Навукові записки / Національний ун-т "Острозька академія". Історичні науки. – Острог, 2003. – Вип. 3. – С. 281–287.

[2] *Вялікі А.Ф.* На раздарожжы. Беларус і палякі ў час перасялення (1944-1946 гг.): Манагр. / Навук. рэд. В.Дз. Селяменеў. – Мн., БДПУ, 2005. – С. 185.

[3] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф.789. – Воп. 1. – Спр. 3. – Арк. 34 адв.

[4] Там же. – Спр. 5. – Арк. 23; Ф. 7. – Воп. 3. – Спр. 1918. – Арк. 45.

[5] Там же. – Ф. 789. – Воп. 1. – Спр. 5. – Арк. 5–6.

[6] Там же. – Ф. 788. – Воп. 1. – Спр. 10. – Арк. 136.

[7] Там же. –Спр. 23. –Арк. 2.

[8] *Сорока Ю.М.* Сучасна украінска історіографія про украінсько-польске переселенне 1944-1946 рр.. Кіивскіий національний університет імені Т. Шевченка. Вісник Історія. – № 63–64. – 2002. – С. 26.

[9] НАРБ. – Ф. 789. – Воп. 1. – Спр. 3. –Арк. 33 адв.

[10] Там же. –Воп. 2. – Спр. 32. – Арк. 32.

[11] Падлічана па: Там же. – Спр. 32. – Арк. 1–173.

[12] Там же. – Спр. 32. – Арк. 149, 149 адв., 150, 150 адв. * Паводле беларуска-польскага пагаднення ад 9 верасня 1944 г. перасяленцы маглі браць з сабой адзенне, абутак, бялізну, прадукты харчавання, рэчы хатняга побыту, сельскагаспадарчы інвентар і іншыя прадметы хатняга і гаспадарчаага побыту агульнай вагой да 2 т. на гаспадарку. Звычайна ў вагоне пераязджала 5-7 гаспадарак. Асобна выдзяляліся вагоны для жывёлы і сельскагаспадарчага інвентару. – *А.В.*

[13] Там же. – Арк. 162, 163 адв., 164 адв.

[14] Там же. –Арк. 92, 92 адв.

[15] Падлічана па:Там же. – Арк. 1–73.

*_Гл. Польша та Украіна... – С.918

[16] НАРБ. – Ф. 789. – Воп. 1. – Спр. 3. – Арк. 35.

[17] Там же. – Воп. 2. – Спр. 31. – Арк. 327.

[18] Там же. – Арк. 329.

[19] Там же. – Спр. 24. – Арк. 342.

[20] Там же . – Воп. 1. – Спр. 3. – Арк. 36.

[21] Там же. – Арк. 34.

[22] Там же. – Спр. 5. – Арк. 46.

[23] Там же. – Арк. 48.

[24] Польша та Украіна... – С. 870.

[25] Там же. – С. 870.

[26] *Рыбак Н.* Дзейнасць і ліквідацыя акаўскіх і постакаўскіх фарміраванняў на Беласточчыне ў святле дакументаў і сілавых структур БССР (1944–1947 гг.) // Bialoruskie Zeszyty Historyczne. – Bialystok, 2006. – S. 179.

[27] НАРБ. – Ф. 4п. – Воп. 29. – Спр. 828. – Арк. 17.

[28] Польша та Украіна...С. 820.

[29] НАРБ. – Ф. 789. – Воп. 2. – Спр. 32. – Арк. 32.

[30] Польша та Украіна... – С. 934.